7. *Мишаткина, Т.В.* «Открытые» проблемы биомедицинской этики / Т.В. Мишаткина // Медицина. – 2007. – № 4. – С. 4 – 6.
8. *Энгельгардт, Х.Т.* Почему не существует глобальной биоэтики? / Х.Т. Энгельгардт // Человек. – 2008. – № 1. – С. 74 – 82.
9. *Кубликова, О.А.* Проблемы социального страхования врача в Российской Федерации / О.А. Кубликова // Медицинское право. – 2008. – № 4. – С. 30 – 32.
10. *Силуянова, И.В.* Антропология болезни / И.В. Силуянова. – М.: Изд-во Сретенского монастыря, 2007. – 304 с.; *Харакас, С.* Православие и биоэтика / С. Харакас // Человек. – 1994. – № 2. – С. 91 – 100; *Карраско де Паула, Игнасио.* Биоэтика. Этика человеческой жизни и целостности личности / И. Карраско де Паула // Нравственное действие христианина. Ливио Мелина [и др.] ; под общ. рук. Л. Мелина. – М.: «Христианская Россия», 2007. – С. 135 – 213 и др.
11. Свод этических правил проведения клинических испытаний и медико-биологических экспериментов на человеке // Вопросы философии. – 1994. – № 3. – С. 91 – 93.

SUMMARY

*The article deals with medical professional culture as a conservative-and-dynamic system; the main factors and mechanisms of its changing are considered from the positions of culturological approach. The author analyses the essence of nowadays condition of professional culture of medical personnel that is revealing itself in the particularly sharp propounding of «open» problems of medicine and possible ways of their resolving – with the aid of a new ethic system called biomedical ethics, and of a new social institute in medical culture – ethic committees.*

*УДК 78:159.937.5*

***Т.С. Гажэўская,***
*старшы выкладчык кафедры харавога і вакальнага мастацтва БДУКіМ*

# РАЗВІЦЦЁ ЭСТЭТЫЧНАГА ЎСПРЫМАННЯ Ў ПРАЦЭСЕ ЛІТУРГІЧНА-ХАРАВОГА ВЫКАНАЛЬНІЦТВА

У наш час, дзякуючы актыўнаму адраджэнню духоўных традыцый у Рэспубліцы Беларусь, узрастае патрэбнасць у стварэнні аматарскіх калектываў асобага тыпу – літургічных. Іх дзейнасць адпавядае прынцыпам, метадыцы і арганізацыі аматарскай мастацкай творчасці, носіць грамадскі характар і накіравана на выхаванне і рэалізацыю творчай, сацыяльна актыўнай асобы (А.В. Веліканава [2], Е.І. Грыгор'ева [4], Н.Г. Міхайлава [8], Е.І. Смірнова [10] і інш.), аднак мае свае спецыфічныя асаблівасці. Літургічны харавы калектыў – грамадскае, добраахвотнае аматарскае аб'яднанне, функцыянаванне якога звязана з ажыццяўленнем чыну св. Літургіі, канцэртнай выканальніцкай дзейнасцю, удзелам у розных духоўных і свецкіх мерапрыемствах, якія спрыяюць удасканаленню, гарманічнаму развіццю, рэалізацыі музычных здольнасцей, творчых магчымасцей асобы на аснове ўсебаковага разумення лепшых узораў духоўнай харавой музыкі. Развіццё літургічных харавых калектываў звязана з адраджэннем агульнай культуры народа, захаваннем і аднаўленнем яго згубленых самабытных і непаўторных традыцый. Дзейнасць літургічнага харавога калектыву накіравана на духоўнае ўдасканаленне, музычную творчасць, якія прадугледжваюць разуменне духоўнай харавой музыкі розных эпох, стыляў, жанраў і накірункаў; асэнсаванае ўспрыманне храмавага мастацтва ў цэлым (архітэктура, жывапіс, скульптура, прыкладное мастацтва, прамоўніцкае мастацтва) і духоўнай харавой музыкі ў прыватнасці. Яна звернута на развіццё здольнасці да эстэтычнага сузірання, самапаглыблення і ўзбагачэння жыццёвага вопыту моладзі; удасканалення пеўчых навыкаў і вопыту вакальна-харавога выканальніцтва.

Далучэнне ўдзельнікаў літургічнага харавога калектыву да духоўнай харавой музыкі дазваляе ім папоўніць свой слыхавы вопыт новымі інтанацыямі, выявамі, якія адрозніваюцца ад фальклору і свецкай музыкі, сутыкнуцца з вечнымі духоўнымі і эстэтычнымі каштоўнасцямі, якія сталі адной з форм мастацкага пазнання свету. У апошнія гады духоўная харавая музыка займае вядучае месца ў рэпертуары шматлікіх прафесійных і аматарскіх харавых калектываў, павышаецца кампазітарская цікавасць да духоўна-музычнай творчасці. Духоўная харавая музыка, як і іншыя віды храмавага мастацтва (архітэктура, скульптура, іканапіс, жывапіс, прамоўніцкае мастацтва (духоўная паэзія, маральная пропаведзь і г. д.)), уяўляе сабой традыцыйную, «каранёвую» галіну культуры, у якой стагоддзямі складаліся вартасныя арыенціры народа – эстэтычныя і мастацкія ідэалы, духоўныя ўяўленні і каштоўнасці. За працяглую гісторыю развіцця духоўнай харавой музыкі была назапашана вялікая колькасць твораў, што ўяўляюць сабой крыніцу мудрасці і прыгажосці, злучаюць у сабе вечныя маральныя ідэі царкоўных пастулатаў, высокамастацкія тэксты і музычную дасканаласць класічных кампазіцый як славянскіх, так і заходнееўрапейскіх майстроў – знакамітых і невядомых.

Духоўная харавая музыка, як і іншыя віды храмавага мастацтва, іграе важную ролю ў развіцці эстэтычных густаў моладзі, аказвае *эмацыянальнае, пазнавальнае, выхаваўчае, развіццёвае ўздзеянне,* спрыяе станаўленню яе

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

музычнай і духоўнай культуры. Як адзначаюць шматлікія педагогі-даследчыкі (В.А. Васільчанка [1], А.А. Вярэм'еў [3], Н.Г. Калашнік [5], М.Я. Кудраўцава [6], Б.Т. Ліхачоў [7], Г. Л. Пад'янава [9]), развіццё эстэтычнага густу здзяйсняецца ва ўмовах мэтанакіраванай эстэтычнай дзейнасці. Для яе рэалізацыі неабходна якператварэнне самой рэчаіснасці па законах прыгажосці, так і развіццё ўнутранага духоўнага свету асобы – яе светапогляду, высокай маральнасці, эстэтычнай успрымальнасці, актыўнай практычнай стваральнай дзейнасці.

*Эмацыянальнае ўздзеянне* адбываецца пасродкам уключэння моладзі ў працэс эмацыянальна-пачуццёвага ўспрымання, пабудаванага на цэласнасці музычна-мастацкай выявы (складваецца на аснове абагульненых ведаў, мінулага эстэтычнага вопыту, эстэтычных уражанняў, эмацыянальнай памяці, а таксама багатай гамы эстэтычных перажыванняў, падахвочванняў, настрояў, характару, перадаваемых інтанацыйна-вобразнай формай музычнага твора, а таксама шэдэўрамі выяўленчага мастацтва), што спрыяе развіццю здольнасці да эстэтычнага сузірання, самапаглыблення і ўзбагачэння эстэтычнага вопыту. Уключэнне ў працэс музычнага ўспрымання духоўных харавых твораў мяркуе мноства слухацкіх інтэрпрэтацый музычнага вобраза, на аснове якіх моладзь выносіць свае эстэтычныя суджэнні, пры гэтым аперыруе ведамі ў галіне гісторыі і тэорыі духоўнай харавой музыкі, яе стылявой і жанравай спецыфікі.

*Пазнавальнае ўздзеянне* мяркуе пашырэнне і паглыбленне ведаў моладзі ў галіне гісторыі і тэорыі духоўнай харавой музыкі, вакальна-харавога выканальніцтва, жанравай і стылявой спецыфікі духоўных харавых твораў, чыну (паслядоўнасці) св. Літургіі і царкоўнага статута (веданне асноўных правіл, абрадаў, традыцый, узаконеных і зацверджаных царквой, па выкананні спеваў вызначанага перыяду літургічнага года), а таксама засноўваецца на развіцці здольнасці да аргументаванага эстэтычнага суджэння на аснове эмацыянальнай адзнакі (вобразныя выказванні, пабудова суджэнняў з дапамогай розных прыёмаў – атаясамліванні, параўнанні, выкарыстанні эпітэтаў) і аналізу духоўных харавых твораў з пасільным ужываннем набытых ведаў аб спецыфіцы духоўнай харавой музыкі, яе стылявых і жанравых асаблівасцях.

*Выхаваўчае ўздзеянне* духоўнай харавой музыкі заключаецца ў літаратурным і музычным тэкстах харавых твораў. Літаратурны тэкст (кананічны і аўтарскі) напоўнены філасофскім, маральным, дыдактычным і інш. зместамі, на аснове якіх развіваюцца духоўныя патрэбнасці моладзі, прысвойваюцца духоўныя каштоўнасці. Музычны тэкст з'яўляецца сродкам, пры дапамозе якога ў памяці і свядомасці моладзі фіксуюцца літургічныя і аўтарскія тэксты, напаўняюцца эмацыянальнай складовай. У працэсе знаёмства моладзі з духоўнай харавой музыкай педагог тым самым далучае яе да вялікага чалавечага вопыту, сканцэнтраванага ў шэдэўрах сусветнай харавой класікі. У гэтай музыцы, што валодае вялікай сілай эмацыянальнага ўздзеяння, адлюстроўваюцца маральна-эстэтычныя і этычныя ідэалы чалавецтва.

*Развіццёвае ўздзеянне* духоўнай харавой музыкі мяркуе мэтанакіраванае ўключэнне моладзі ў працэс эстэтычнай дзейнасці ў сферы вольнага часу. Яна засноўваецца на развіцці інтэлектуальнай, эмацыянальнай, валявой сфер моладзі, эстэтычнага і духоўнага яе ўдасканалення і істотна ўплывае на здольнасць успрымаць, шанаваць і ствараць адметнае ў мастацтве і навакольнай рэчаіснасці. Сярод яе відаў, накіраваных на разуменне духоўнага харавога мастацтва, можна вылучыць: засваенне духоўных харавых твораў розных эпох, стыляў, накірункаў і жанраў, што адносяцца да шэдэўраў сусветнай класікі, старадаўняй і сучаснай духавой харавой музыкі; фестывальную і канцэртную дзейнасць, удзел у св. Літургіі, храмавых і хрысціянскіх святах, экскурсіях.

Эстэтычная дзейнасць засноўваецца таксама на ўдасканаленні вакальна-харавых навыкаў (гукавылучэнне, гукаўтварэнне, гуказнаўства, музычны слых (меладычны, гарманічны), дыханне, дыкцыя, лад, пачуццё рытму, ансамбль, выразнасць і экспрэсія), старанна ўзгодненых, якія ўзаемна дапаўняюць і абумоўліваюць адзін аднаго ў працэсе працы з аматарскім харавым калектывам. Набыццё практычных уменняў і навыкаў адбываецца ў працэсе рэпетыцыйнай працы, пабудаванай на комплексе вакальна-харавой тэхнікі: дыхальнай гімнастыцы, вакальна-харавых практыкаваннях, развучванні духоўных харавых твораў. Эстэтычная дзейнасць мяркуе таксама набыццё вопыту вакальна-харавога выканальніцтва, які прадугледжвае сістэматычныя рэпетыцыі, удзел у св. Літургіі, канцэртах, храмавых і хрысціянскіх святах, конкурсах, фестывалях духоўнай харавой музыкі, музычнай майстэрні, літургічнай драме, містэрыі і інш.

Для арганізацыі працэсу, накіраванага на павышэнне ўзроўню сфарміраванасці эстэтычнага густу ўдзельнікаў літургічных харавых калектываў, неабходны ўлік і рэалізацыя наступных педагагічных умоў. Адной з асноўных умоў развіцця эстэтычнага густу моладзі з'яўляецца стварэнне *педагагічна-камфортнага асяроддзя, творчай, добразычлівай атмасферы,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*спрыяльнага псіхалагічнага клімату ў аматарскім харавым калектыве.* Педагагічна камфортнае асяроддзе спрыяе творчаму росту і актыўнасці ўдзельнікаў: развіццю іх эмацыянальна-пачуццёвай сферы і інтэлекту, эстэтычнай назіральнасці, тонкасці эстэтычнага ўспрымання, мастацкага бачання, музычных здольнасцей; набыццю ўменняў і навыкаў вакальна-харавога выканальніцтва, сцэнічнага вопыту выступленняў, эстэтычнага і духоўнага іх удасканалення. Узаемаадносіны паміж удзельнікамі калектыву вядуць да ўзаемнага іх узбагачэння.

Другой важнай умовай з'яўляецца *развіццё сэнсорнага вопыту і асацыятыўнага мыслення пасродкам комплексу мастацтваў* (духоўная харавая музыка, жывапіс, архітэктура, прыкладное мастацтва, паэзія), якія спрыяюць арыентацыі моладзі ў сродках стварэння музычна-мастацкага вобраза, дзякуючы якому ўдзельнікі літургічных харавых калектываў на аснове мастацкіх сродкаў (параўнанняў, увасабленняў, эпітэтаў) выяўляюць залежнасць паміж цэласнай мастацкай выявай духоўнага харавога твора і яго мастацкім увасабленнем у шэдэўрах выяўленчага мастацтва. Яны засвойваюць істотныя прыкметы мастацкага вобраза, мэтазгоднасць мастацкіх сродкаў у раскрыцці яго зместу, логіку развіцця і адлюстроўваемых падзей, залежнасць мастацкага вобраза ад ідэйна-мастацкай задумы кампазітара. Мастацкія вобразы аднаго мастацтва не заўсёды асацыіруюцца ўдзельнікамі з вобразамі сумежных мастацтваў, а гэта значыць, што без мэтанакіраванай працы па развіцці творчага ўзнаўляльнага ўяўлення, узаемасувязі атрыманых уражанняў у працэсе зносін з комплексам розных відаў мастацтва ў моладзі не актуалізуюцца асацыятыўныя сувязі. Дзякуючы сумежным мастацтвам, адкрываецца магчымасць сфарміраваць у ўдзельнікаў аматарскага харавога калектыву здольнасць да ўзнаўлення цэласнай мастацкай выявы. Пры ўспрыманні музычных твораў у іх актуалізуецца эстэтычны вопыт, разнастайнасць мастацкіх уражанняў, асацыяцый, атрыманых пры зносінах з іншымі відамі мастацтва, паколькі кожны від мастацтва лагічна працягвае рашэнне вызначаных, агульных для ўсіх, пазнавальнай і выхаваўчай задач. Спасціжэнне духоўнага харавога мастацтва ў комплексе з іншымі відамі мастацтва (духоўная харавая музыка, выяўленчае мастацтва) спрыяе раскрыццю агульнасці мовы мастацтваў: асацыятыўнасці, метафарычнасці, умоўнасці, вобразнасці.

Неабходнай умовай развіцця эстэтычнага густу моладзі з'яўляецца таксама *здольнасць да эстэтычнага суджэння на аснове атрыманых ведаў і набытага сэнсорнага вопыту.* Гэта ўмова мяркуе ўключанасць моладзі ў працэс музычнага ўспрымання і аналізу духоўных харавых твораў і, такім чынам, у мноства слухацкіх інтэрпрэтацый музычнага вобраза, на аснове якіх удзельнікі літургічнага харавога калектыву выносяць свае эстэтычныя меркаванні. Аналіз твораў духоўнай харавой музыкі мяркуе абавязковае захаванне яго ідэйна-эстэтычнай цэласнасці. Музычныя творы аналізуюцца ў комплексе гісторыка-біяграфічнага, ідэйна-эстэтычнага, сюжэтна-кампазіцыйнага і мастацка-выразнага аспектаў, гэта значыць характарызуецца эпоха, у якой створаўся прапанаваны духоўна-харавы твор, асоба кампазітара, гісторыя стварэння твора, ідэйна-эстэтычная канцэпцыя аўтара кампазіцыі, стыль яго пісьма – усе гэтыя агульнаэстэтычныя пастулаты з'яўляюцца метадалагічнай асновай аналізу духоўных харавых твораў. Веды па тэорыі і гісторыі духоўнай харавой музыкі, а таксама выкарыстанне сумежных мастацтваў спрыяюць фарміраванню ў моладзі цэласнасці эстэтычнага ўспрымання, узбагачэнню новымі мастацка-вобразнымі ўражаннямі, што прыводзіць да ўсвядомленасці эмацыянальных рэакцый.

Вызначальнай умовай развіцця эстэтычнага густу моладзі ў літургічным аматарскім харавым калектыве з'яўляецца назапашванне вопыту вакальна-харавога выканальніцтва:

а) знаёмства са шматлікім і разнастайным рэпертуарам духоўнай харавой музыкі розных стыляў, накірункаў і жанраў, што адносяцца да шэдэўраў сусветнай класікі, старадаўняй і сучаснай духавой харавой музыкі;
б) удасканаленне вакальна-харавых навыкаў (гукавылучэнне, гукаўтварэнне, гуказнаўства, музычны слых (меладычны, гарманічны), дыханне, дыкцыя, лад, пачуццё рытму, ансамбль, выразнасць і экспрэсія);
в) уключэнне ўдзельнікаў літургічнага аматарскага харавога калектыву ў фестывальную і канцэртную дзейнасць, св. Літургію, храмавыя і хрысціянскія святы, нетрадыцыйныя формы сацыякультурнай дзейнасці: музычную майстэрню, літургічную драму, містэрыі і г. д.

Варта адзначыць, што практычная харавая дзейнасць заключаецца ў развучванні і выкананні духоўнай харавой музыкі, прадстаўленай узорамі славянскага і заходнееўрапейскага духоўнага харавога мастацтва розных эпох, стыляў, накірункаў і жанраў. Музычныя рэпетыцыі дапамагаюць моладзі ўсвядоміць значнасць і мастацкую каштоўнасць духоўнага харавога мастацтва.

ЛІТАРАТУРА

1. *Васильченко, О.А.* Формирование эстетического вкуса подростков в процессе школьной музыкально-хоровой дея-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тельности: дис. ... канд. пед. наук / О.А. Васильченко. – Ташкент, 1991. – 228 с.

2. *Великанова, Е.В.* Самодеятельное художественное творчество как основа возрождения национальных культурных традиций: дис. ... канд. пед.наук / Е.В. Великанова. – Тамбов, 2000. – 223 с.
3. *Веремьев А.А.* Эстетическое воспитание в системе педагогического образования: монография / А.А. Веремьев. – Брянск: Изд-во Брянс. гос. ун-та, 2001.–124 с.
4. *Григорьева, Е.И.* Современные технологии социально-культурной деятельности: учеб. пособие / отв. ред. Е.И. Григорьева. – Тамбов: Изд-во ТГУ им. Г.Р. Державина, 2002. – 504 с.
5. *Калашник, Н.Г.* Прикладаная густосология / Н.Г. Калашник, Н.А. Зацепина. – Запорожье: Полиграф, 2004. – 255 с.
6. *Кудрявцева, М.Е.* Психолого-педагогические основы деятельности учителя по воспитанию эстетического вкуса учащихся: дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / М.Е. Кудрявцева. – СПб., 2002. – 220 с.
7. *Лихачев, Б.Т.* Теория эстетического воспитания школьников: учеб. пособие по спец. курсу для пед. ин-тов / Б.Т. Лихачев. – М.: Прометей, 1992. – 528 с.
8. *Михайлова, Н.Г.* Самодеятельное художественное творчество в современ ных условиях и направления его исследования // Народное творчество. Перспективы развития и формы социальной организации: сб. науч. тр. / Мин-во культуры РСФСР: АН СССР; НИИ культуры. – М., 1990. – С. 6 –12.
9. *Подъянова, С.М.* Развитие художественного вкуса студентов пед. вуза: дис. ... канд. пед. наук: 13.00.08 / СМ. Подьянова. – Челябинск, 2004.
10. *Смирнова, Е.И.* Художественная самодеятельность как социально-педагогическое явление: дис. ... д-ра пед. наук: 13.00.05 / Е.И. Смирнова. – М., 1989. – 488 с.

*Summary*

*The problem of development aesthetic taste of youth by the instrumentality of liturgical choral singing is considered. The ways and areas are pointed of its formation.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ